КУЛЬТУРА

"ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ"

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 1 (1544)
1 студзеня 2022 г.

5 студзеня 2022 года міністр культуры Анатолій Мечыслававіч Маркевіч правядзе асабісты прыём грамадзян. Папярэдні запіс на прыём ажыццяўляецца па тэлефоне: +375 17 203 75 74.

2022

Сто граняў Дыямента

А дна з яркіх падзей у 2022-м — вераснёўскае святкаванне 100-гадовага юбілею Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Гэтая дата летась была ўнесена ў прэстыжны спіс памятных дат календара UNESCO, што гаворыць аб велізарным аўтарытэце нашай кніжнай скарбніцы ва ўсім цывілізаваным свеце! Сучасны будынак яе, які мы называем "дыяментам", паўстаў дзякуючы ініцыятыве Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Кіраўнік дзяржавы прымаў дзейсны ўдзел не толькі ў абмеркаванні архітэктурнага праекта, але і непасрэдна закладаў у падмурак будынка першую сімвалічную цагліну на агульнарэспубліканскім суботніку, працуючы разам з будаўнікамі.

Рэдакцыя "К" вырашыла зрабіць навагодні падарунак чытачам і, вядома, супрацоўнікам "Нацыяналкі" ў выглядзе традыцыйнага нашага календара. На ім вы ўбачыце, што "дыямент" адметны не толькі шыкоўным і зручным інтэр'ерам, багаты не толькі на кніжныя скарбы, але і на творы мастацтва. І гэта адна з унікальных граняў са стагадовай гісторыі бібліятэкі...

К

Фота Юрыя ІВАНОВА

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

9 771994 478007 22001

Плёну, міру, дабрабыту!

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Паважаныя калегі! Дарагія сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з надыходзячым Новым годам і Калядамі! Традыцыйна гэтымі святочнымі днямі мы згадваем найбольш яскравыя падзеі, падводзім вынікі, вызначаем перспектывы.

Дзякуючы нашым сумесным намаганням зроблена шмат. Год запомніўся яркімі канцэртамі, паспяховымі прэм'ерамі, гучнымі перамогамі. Незабыўную атмасферу творчасці мы адчулі на Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" і Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад". Гэтыя аўтарытэтныя форумы — сімвалы нашай незалежнай дзяржавы — сталі сапраўдным святам вялікага сяброўства народаў.

Плённа працавалі і на ніве аднаўлення помнікаў архітэктуры, у сферы будаўніцтва аб'ектаў культуры. Яны актыўна, у тым ліку ў рэгіёнах, адчыняюць свае дзверы для наведвальнікаў.

Адыходзячы год прайшоў пад знакам народнага адзінства. Патрыятызм, высокія ідэалы, добразычлівыя адносіны паміж людзьмі розных нацыянальнасцей і веравызнанняў — жыццесцвярджальная сіла беларускага народа, каштоўны дар продкаў, які мы абавязаны захаваць.

Паважаныя калегі! Прыміце шчырыя словы падзякі за ваш унёсак у справу развіцця Беларусі. Усе нашыя дасягненні сталі магчымыя дзякуючы вашай штодзённай добрасумленнай рабоце. Упэўнены, што ў новым годзе мы з яшчэ большай энергіяй будзем працаваць на карысць Радзімы.

Няхай новы 2022 год стане для ўсіх нас годам ажыццяўлення самых добрых і чыстых жаданняў! Здароўя, міру, дабрабыту вам і вашым сем'ям!

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч

Сяргей Панасюк, начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама:

— Паважаныя работнікі культуры! Вось і завяршыўся 2021 год. Ён быў адзначаны шэрагам значных культурных падзей, як у Брэсцкай вобласці так і за яе межамі. Наша прафесійная дзейнасць і далей будзе спрыяць стварэнню неабходных умоў для развіцця і рэалізацыі культурнага патэнцыялу кожнай асобы і грамадства ў цэлым. Мы павінны выкарыстоўваць свой гуманітарны рэсурс, павышаць міжнародную цікавасць да нашай гісторыі, традыцый, мовы і культурных каштоўнасцей. Мы па праве ганарымся беларускай культурай. Культура — гэта, вядома, жывы арганізм, які ўвесь час развіваецца і мае патрэбу ў прытоку новых сіл.

Дазвольце павіншаваць вас, работнікі культуры і чытачы газеты "Культура", ад імя ўсіх работнікаў культуры Брэсцкай вобласці і ад сабе асабіста з Новым, 2022 годам і пажадаць вам, каб ён быў напоўнены цеплынёй, шчырасцю і натхненнем, быў насычаны цікавымі праектамі, творчымі ідэямі і яркімі поспехамі. Прыміце самыя шчырыя пажаданні дабрабыту і здароўя, узаемаразумення ў вашых сем'ях, цяпла і ўтульнасці ў вашых дамах!

Пётр Падгурскі, начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканка:

— Шаноўныя работнікі культуры! Вы прысвячаеце сваё жыццё высакароднай справе, у якой прагнеце задзейнічаць як мага больш людзей, бо культура — здабытак усяго народа! Нягледзячы на няпросты 2021 год работнікі культуры Віцебскай вобласці правялі 12 міжнародных, 4 рэспубліканскіх і больш за 20 рэгіянальных фестываляў, свят, конкурсаў. Вялікі дзякуй за вашу працу!

Віншую вас з Новым годам і Калядамі, жадаю вашаму творчаму генію квітнець і расці ў атмасферы любові і разумення, а ў асабістым жыцці хай спадарожнічаюць дабрабыт, здароўе, удача і павага! Невычэрпнай крыніцы энергіі, аптымізму і крэатыву! З вашай дапамогай наша жыццё становіцца прыемней і весялей! Стварайце з натхненнем!

Дзяніс Язерскі, начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама:

— Дарагія сябры, калегі, чытачы газеты "Культура"! Шчыра віншуем вас з Новым годам і Калядамі. Перагортваючы апошні ліст календара мы падводзім вынікі адыходзячага года, які быў няпростым, але разам з тым цікавым. Мы працягнулі ўдасканальваць сваю працу ва ўмовах некаторых абмежаванняў, звязаных з пандэміяй. На працягу года мы праводзілі цікавыя мерапрыемствы і ўдзельнічалі ў іх, арганізавалі навучальны працэс ва ўстановах адукацыі без збояў у праграме.

У бягучым годзе дзяржава не пакінула без падтрымкі галіну — завершаны рамонтныя работы дома культуры Гомельскага раёна, адкрыта музейная экспазіцыя "Стаянка першабытнага чалавека" ў Юравічах Калінкавіцкага раёна, у гэтым жа населеным пункце актыўна працягваюцца работы на аб'екце гісторыка-культурнай каштоўнасці "Комплекс былога калегіума езуітаў", праведзены маштабныя рамонтныя работы ў каледжы мастацтваў імя Сакалоўскага, пачаты работы на знакавым аб'екце "Партызанская крынічка", пасля правядзення капітальных работ адкрыты Добрушскі раённы дом культуры. Трэба адзначыць і значнае абнаўленне базы музычных інструментаў.

Насычаную і разнастайную афішу культурных мерапрыемстваў склалі яскравыя цікавыя праекты. Адбыліся рэспубліканскія фестывалі "Берагіня" і "Аўцюкі", у якіх прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх абласцей краіны, міжнародны конкурс "Музыка надзеі", абласны конкурс "Майстар", фестываль кнігі "ЧытайГомель", шэраг абласных конкурсаў народнай творчасці, фестываль "На зямлі Кірылы Тураўскага", фестываль-конкурс "Вясёлка, якая спявае" і іншыя. Гомельшчына годна прадстаўлена на конкурсе "Міс Беларусь" і атрымала два прызавыя месцы. Актыўна працавалі музейныя ўстановы, прэм'ернымі спектаклямі і праграмамі насычаны афішы тэатральна-відовішчных арганізацый.

Яркімі мерапрыемствамі былі адзначаны нашы юбіляры — 100 гадоў споўнілася каледжу мастацтваў імя Сакалоўскага, 25 гадоў адзначыў эстрадна-сімфанічны аркестр імя Юрыя Васілеўскага Гомельскай абласной філармоніі. Традыцыйна адной з самых ганаровых узнагарод з'яўляецца прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне", якой адзначаны аўтарскі калектыў архітэктараў і ідэйных натхняльнікаў Гомельшчыны за стварэнне мемарыяльнага комплексу на месцы спаленай вёскі Ала ў Светлагорскім раёне. Палацава-паркавы ансамбль стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу на лепшае добраўпарадкаванне тэрыторыі сярод абласных устаноў, абласны цэнтр народнай творчасці перамог у рэспубліканскім конкурсе на лепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі ў намінацыі "Лепшае культурнае мерапрыемства народнай творчасці патрыятычнай тэматыкі". І гэта толькі асноўныя перамогі.

Няхай надыходзячы год будзе паспяховым і плённым, стане залогам стабільнасці, прынясе мноства прафесійных перамог і дасягненняў на карысць роднай Беларусі! У гэтыя святы прыміце самыя добрыя і шчырыя пажаданні моцнага здароўя, міру і дабрабыту!

Алена Клімовіч, начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама:

— Для сферы культуры Гродзенскай вобласці 2021 год стаў знамянальным і быў багатым на падзеі. Гэта і адкрыццё новай экспазіцыі у Гальшанскім замку, завяршэнне работ па стварэнні экспазіцыі 1-й чаргі Старога замка ў Гродна, увядзенне ў эксплуатацыю многафункцыянальнага культурнага комплексу ў Астраўцы. Але, безумоўна, галоўным здабыткам з'яўляюцца людзі, якія плённа працуюць на ніве культуры. Статус народнага майстра прысвоены майстру Наталлі Клімко з Навагрудскага раёна, народным майстрам Мар'янам Скрамблевічам з Гродзенскага раёна на сродкі Гранта Прэзідэнта Беларусі рэалізаваны творчы праект па адкрыцці майстэрні, заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь "Гродзенскі абласны тэатр лялек" стаў пераможцам Нацыянальнай тэатральнай прэміі ў 2-х намінацыях, аб'ект нематэрыяльнай культурнай спадчыны "Смаргонскія найгрышы" ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Паважаныя сябры, дарагія калегі! Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця, творчых здзяйсненняў на карысць нашай роднай Рэспублікі Беларусь!

Алег Стэльмашок, начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама:

— Кожны адыходзячы год пакідае за сабой рэалізаваныя праекты, новыя знаёмствы і прыемныя моманты. Яркім пацвярджэннем таму для Магілёўшчыны служаць такія культурныя падзеі, як міжнародныя фестывалі дзіцячай творчасці "Залатая пчолка", анімацыйных фільмаў "Анімаёўка", Рэспубліканскае свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў"). Гэта быў час напружанай працы на карысць роднага краю, час прафесійных поспехаў, прадуманых і ўзважаных рашэнняў. Кожны з нас унёс пасільны ўклад у тое, каб пераадолець цяжкасці і ўпэўнена ступіць у Новы, 2022 год. Новы год — гэта не проста свята або пачатак каляндарнага перыяду, гэта перш за ўсё новыя надзеі і поспехі. У нас ёсць усе падставы пазітыўна глядзець у будучыню, бо пабудаваны дакладныя планы і ёсць рэальныя магчымасці па іх увасабленні!

Жадаю вам ажыццяўлення запланаванага, новых крэатыўных творчых праектаў! Няхай новы год прынясе толькі прыемныя сюрпрызы, выдатныя навіны, удачу і поспех! Няхай усё добрае, што радавала ў адыходзячым годзе, абавязкова знойдзе свой працяг у годзе надыходзячым, а кожны яго дзень дорыць каласальны зарад жыццёвай энергіі, пазітыву.

Ала Шахоцька, начальнік упраўлення культуры Мінскага аблвыканкама:

— Для нас адыходзячы год запомніўся тым, што галоўнае ўпраўленне культуры Мінскага аблвыканкама было аддзелена ад упраўлення ідэалогіі і па справах моладзі, што дало магчымасць палепшыць работу. Акрамя таго, Барысаў быў культурнай сталіцай краіны, дзе таксама прайшла важная выстава "Дасягненняў у сферы культуры краін СНД". У Капылі ж праходзіў Дзень пісьменства. У надыходзячым годзе наш рэгіён павінен будзе годна правесці юбілей класікаў айчыннай літаратуры — Янкі Купалы і Якуба Коласа. Таксама закладзена добрая традыцыя праводзіць фестываль рэканструкцый у Нясвіжскім замку. Усім калегам я хачу пажадаць рэалізацыі паспяховых творчых пошукаў, каб наш глядач быў задаволены і ўдзячны нам за працу.

Віталь Брэль, начальнік упраўлення культуры Мінскага гарвыканкама:

— Для сталіцы 2021 год быў хутчэй пазітыўным. Па-першае, установы культуры пачалі працаваць лепш, запаўняльнасць залаў павысілася, бо распаўсюджванне пандэміі каранавіруса ў нашай краіне сталі трымаць пад кантролем. Па-другое, у мінулым годзе ў Мінску адбылося мноства яркіх мерапрыемстваў, такіх як Дзень горада, Навагодніх святы, а таксама ўпершыню быў адзначаны Дзень народнага адзінства. Мінгарвыканкам ужо запланаваў пэўныя падзеі ў надыходзячым годзе, сярод якіх адна з самых важных — юбілейны, 955-ты Дзень горада Мінска. Таксама для нас важна будзе ўнесці свой уклад у арганізацыю надыходзячага рэферэндуму. Усім чытачам "Культуры" хачу пажадаць моцнага здароўя, міру і шчасця.

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Галоўны рэдактар** — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **адказны сакратар** — Ксенія ПАДОЛЬЦАВА; **рэдактар аддзела:** Яўген РАГІН; **агляльнікі рэдакцыі:** Змітсер ЮРКЕВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЁЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2021.
Наклад 3302. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 29.12.2021 у 18.00. Замова 21.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

Васіль Сумараў. “На зямлі бацькоў”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
					1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31						

Да 100-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Уладзімір Зінкевіч. “Беларуская кніга”. Іван Кліменка. “Гартаючы старыя старонкі”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28													

100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Леў Гумілеўскі, Сяргей Гумілеўскі. “Сказ аб Нясвіжы”.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Зоя Літвінава. “Танец”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31										

100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Гаўрыіл Вашчанка. “Айчына”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
				1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30								

100 -годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Аляксандр Батвінёнак, Аляксандр Чыгрын. “Сымон-музыка”.

Віктар Грамыка. “Песня аб маім атрадзе”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
						1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31					

100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Валянціна Крывашэева. “Па старонках Чырвонай кнігі”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
		1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30										

100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Сяргей Логвін. “Купалінская ноч”.

Леанід Шчамялёў. “Музычны Віцебск”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
				1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31							

100 -годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Ігар Рымашэўскі. “У мастака”.

Георгій Скрыпнічэнка. “Сусвет жакея”.

Мікалай Селяшчук. “Лета”.

100 -годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
1	2	3	4	5	6	7
22	23	24	25	26	27	28

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
8	9	10	11	12	13	14
29	30	31				

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
15	16	17	18	19	20	21

Алена Ахрамовіч. “Ной са Слабодкі”.

Алена Шлегель. “Вянок санетаў”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30									

Уладзімір Слабодчыкаў. “Восеньскія святы”.

100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Георгій Паплаўскі. “Слова аб палку Ігаравым”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
					1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31						

100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Віктар Ціханаў. “Караблі адвечнасці”.

Май Данцыг. “Мой Мінск”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
	1	2	3	4	5	6
21	22	23	24	25	26	27

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
7	8	9	10	11	12	13
28	29	30				

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
14	15	16	17	18	19	20

Павел Лук. “Дрэва беларускага пісьменства”.

100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Галіна Крыва блоцкая. “Мелодыя зямлі”.

Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз	Пн	Аў	Ср	Чц	Пт	Сб	Ндз
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29	30	31								

100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Сяргей Бандарэнка. “Песня пра зубра”.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ і Наталлі ОВАД

Светам кіруе любоў!

“Шчаўкунок” даўно прызнаны адной з самых навагодніх казак — яшчэ і таму, што дзеянне там адбываецца на Каляды. Зварот шматлікіх тэатраў да гэтага сюжэта — таксама справа звыклая. Аднайменны балет Валянціна Елізар’ева ў Вялікім тэатры — увогуле жывая класіка. У такім размаітым атачэнні з’яўляецца яшчэ адзін “Шчаўкунок” — мюзікл-балет Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля народнага танца Беларусі ў пастаноўцы Валянціна Дудкевіча — і казка набывае новы разгорт, зачараванне прыгажосцю, свежы подых актуальных жыццёвых ісцін…

Надзея БУНЦЭВІЧ /
Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Без усялякага перабольшвання зазначу, што сярод шматлікіх навагодніх імпрэз, прызначаных для дзяцей і сямейнага прагляду, цяперашні спектакль на сцэне сталічнай філармоніі — адзін з самых лепшых за многія гады. Гэта папраўдзе калядная казка — светлая, з вялізным пасылам дабрыні і любові, без традыцыйнага знішчэння мышэй, што маюць намер перашкодзіць святу.

Адштурхнуўшыся ад знакамітага гофманаўскага сюжэта, В.Дудкевіч стварае постмадэрнісцкі сіквел — працяг вядомай гісторыі, дзе сітуацыя дэжавю становіцца не прамым паўторам, а новым вітком знаёмых падзей з непрадказальнымі паваротамі і зусім нечаканым фіналам. Акрамя “Шчаўкунка”, скарыстаны і некаторыя моманты “Спячай прыгажуні” — менавіта з лібрэта балета Чайкоўскага, а не казкі Шарля Перо: у госці да Машы завітваюць героі іншых казак (Чырвоны Каптурок і Шэры Воўк, Кот у ботах, Хлопчык-з-мезенчык, Людаеды), у чароўным замку цукерак і прысмакаў Канфетэнбургу дзяўчынку чакаюць адразу пяцёра жаніхоў з розных краін: Кітая, Іспаніі, Італіі, Йемена, Расіі. Не прызнае сваю колішнюю паразу і Мышыны Кароль. Спачатку са сваім мышыным войскам хоча зноў з’есці ўсё салодкае, потым вырашае ажаніць з Машай свайго сына, хаця таму даспадобы Пацучыня. Пачынае бойку супраць алавяных салдацікаў — і... Маша яе спыняе: “Каму патрэбна гэтая вайна? Дамаўляцца трэба, бо светам кіруе любоў!”

Ідэя сяброўства і еднасці была рэалізавана не толькі ў сюжэце, але і ў выканальніцкім складзе. Да артыстаў Дзяржансамбля танца далучыліся выхаванцы дзіцячай школы пры гэтым калектыве. Размоўныя дыялогі агучвалі акцёры драмтэатраў, спеўныя нумары запісвалі ансамблі “Камерата” і “Песняры”. Чым не прыклад беларускай талакі, калі штосьці робіцца разам — і весела?

Яшчэ адзін прыклад непадзельнай еднасці — у сінтэзе мастацтваў і асобных жанраў, памножаных на адкрытасць навізны. Бо ў выніку атрымліваецца мюзікл-балет, харэаграфічны мюзікл — чым не новае жанравае адгалінаванне?

Неўміручая музыка Чайкоўскага гучыць у новых “адзеннях” адметнай аранжыроўкі — у тым ліку вакальнай, эстраднай, джазавай, штораз з новымі тэмбравымі гучаннямі. Елачкі сцэнаграфіі Юрыя Барысевіча паварочваюцца з і пераўтвараюцца ў цукеркі з розным начыннем. Колькасць і разнастайнасць сцэнічных строяў — папраўдзе неверагодная. Невыпадкова над імі працавалі адразу пяцёра мастакоў: Ірына Румас, Алена Пашкевіч, Антон Ярошчык, Алена Смірнова, Марына Парфяновіч. У харэаграфіі — вельмі гарманічная, у поўным сэнсе слова талерантная сумесь балетнай класікі і неакласікі, уключаючы праславутыя пуанты, з эстраднымі “сваволь-ствамі”, элементамі народнага, характарнага танцаў, пантамімы, нават балета на лёдзе. Бо тая ж фея Месяцавага святла, падобная да Мяцеліцы, раз’язджае па сцэне на роліках з падсветкай. Свецяцца і шарыкі-зоркі на яе касцюме з доўгімі крыламі-накідкай. Выкарыстоўваюцца лялькі — папугай, мышаня. Увесь гэты сінтэз зноўтакі пададзены не знарочыста, а вельмі натуральна, па-еўрапейску, бы штосьці цалкам зразумелае — з асаблівай тактоўнасцю, нават у моманты мяккай іроніі.

Знаўцы харэаграфіі ацэняць некалькі пластычных разыначак, што надаюць відовішчу яшчэ большую прыцягальнасць. Дый для артыстаў Ансамбля танца гэта своеасаблівы эксперымент. І ён цалкам атрымаўся!

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Новы выставачны корпус К. Маркса, 24
■ **"Рух зямлі".** Да 13 лютага.
■ **"Выратаваныя мастацкія каштоўнасці".** Творы старажытнабеларускага, рускага і еўрапейскага мастацтва XVII–XX стст. са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, якія прайшлі рэстаўрацыю за 2010 — 2021 гг. Да 13 лютага.
■ Выстава **"Юрый Карачун. Да 90-годдзя з дня нараджэння. Акварэль, малюнак, жывапіс"**. Да 31 студзеня.

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)

Пастаянныя экспазіцыі:
■ Старажытнабеларускага мастацтва;
■ Мастацтва Беларусі XIX ст.;
■ Мастацтва Беларусі XX ст.;
■ Рускае мастацтва XVIII–XX стст.;
■ Мастацтва Еўропы XVI–XX стст.;
■ Мастацтва краін Усходу XIV–XX стст.;
■ 50 шэдэўраў.

Выставы:
■ Выставачны праект **"Перадзвіжнікі. Рэалізм. Асвета. Бізнес"**. Да 23 студзеня.
■ Выставачны праект беларускага жывапісца **Леаніда Васільевіча Хобатава** (нар. 1950). Да 30 студзеня.
■ Выставачны праект **"Час цыклонаў"**. Жывапіс і графіка Галіны Нячаевай", прымеркаванага да юбілею аўтара. Да 29 лютага.
■ Інтэрактыўная праграма **"Усё самае цікавае пра фарфор"** (7+). 3 студзеня ў 13.00. 5 студзеня ў 13.00.
■ Праграма **"Раство. У госці да Міхаіла Радзівіла"** (для дзяцей 9–12 гадоў). 5 студзеня ў 11.00. 6 студзеня ў 14.00. Па папярэднім запісе.
■ Інтэрактыўная праграма **"Каляднымі сцежкамі"**. Для дзяцей 6–12 гадоў. 3 студзеня ў 12.00 па папярэднім запісе.
■ Творчая майстэрня для дзяцей і бацькоў. Творчыя майстэрні працуюць на працягу ўсяго працоўнага дня музея без папярэдняга запісу па ўваходным білеце ў музей. Па 9 студзеня.
■ Інтэрактыўная экскурсія **"Якога колеру зіма"** (для дзяцей 6–12 гадоў). Па 28 студзеня. Для арганізаваных груп па папярэднім запісе.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 358 88 78
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ **Культура і мастацтва першай паловы XIX ст."**
Выстава **"Архітэктура і пейзаж"**. Да 14 студзеня.
■ Выстава аўтарскай лялькі Ірыны Пракоф'евай **"Увасабленне"**. Да 15 студзеня.
■ Тэматычная праграма **"Раство ў Ваньковічаў"** з майстар-класам па вырабе навагодніх цацак. Па 8 студзеня. Групы фарміруюцца па папярэднім запісе.
■ Спектакль тэатра ценяў **"Сядзібны прывід"**. Па папярэднім запісе кожную суботу а 12-й і 16-й гадзінах. Для арганізаваных груп кожную гадзіну штодзённа.
■ Сюжэтна-гульнявая праграма **"Метамарфозы ў сядзібным доме"**. У працэсе сюжэтна-гульнявой праграмы ўдзельнікі пазнаёмяцца з традыцыямі маскарадных паказаў XVIII стагоддзя, якія наладжваліся як у імператарскіх рэзідэнцыях, так і ў сядзібах знаці, адчуюць не толькі атмасферу мінулых стагоддзяў, але і з дапамогай інтэрактыву пазнаёмяцца з экспанатамі музейнай калекцыі.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Беларускае золата"** да 14 студзеня 2022 г.
■ **Батлейка.** Спектаклі адбываюцца кожную нядзелю а 12-й гадзіне. Для арганізаваных груп магчыма арганізацыя комплекснай праграмы з транспартнымі паслугамі, майстар-класам і пачастункам. Папярэдні запіс абавязковы.
■ **"На Каляды ў музеі".** Папярэдні запіс абавязковы.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Някрасава, 3. Тэл.: 399-09-78
Час працы: серада-нядзеля з 12:00 да 20:00
■ Выставачны праект **"Тату ў мастацтве. Мастацтва ў тату"**.
■ Выстава **"Зіма, і ўсё зноў упершыню"**.
■ Выставачны праект **"KNITTING ISOLATION OUT: паток. пяцельки. ізаляцыя"**.
■ Шостая выстава архітэктурных праектаў Школы архітэктурнага мыслення для дзяцей

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47. Тэл.: 242-78-14
Час працы: аўторак-нядзеля з 12:00 да 20:00
■ Выстава **"Рафаэль. Эпоха Рэнесансу"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8. Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66. Музей працуе: аўторак, серада, пятніца, субота, нядзеля — з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), чацвер — з 12.00 да 20.00 (касы да 19.30), панядзелак — выхадны.
Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"Бітва за Маскву. Неўміручасць подзвігу"**. Да 30 студзеня 2022 г.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА "НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19 тэл.:+375177020602, 20660, +375295518051, +375291903149
Палацавы ансамбль:
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"** — у складзе пастаяннай экспазіцыі.
■ Віртуальная выстава "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры".
■ Выстава **"Добрыя весткі. Паштовая карэспандэнцыя XX ст."** Па 28 лютага ў Малой выставачнай зале Палацавага ансамбля.
■ Экспазіцыя работ Анастасіі Фяцісавай **"Стары Брэст-Нясвіж"**. Па 14 сакавіка 2022 г. у Вялікай выставачнай зале палаца Радзівілаў.
■ Выставачны праект Максіма Пятруля **"de Канструкцыя"**. Па 3 ліпеня 2022 г. у залах сталай экспазіцыі Палацавага ансамбля.

Ратуша:
г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ **"Калядны баль з прыгодамі"**. Па 10 студзеня 2022 г.
■ Тэатралізаванае мерапрыемства **"Калядны прыём у княгіні"**. Па 10 студзеня.
Слуцкая брама:
Падрабязную інфармацыю можна даведацца па тэлефонах (+3751770) 20602, (+3751770) 20660 альбо на сайце niasvizh.by.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ I Рэспубліканскі адкрыты фестываль-конкурс фартэпіяннай музыкі "Музычны Свет" пройдзе ў завочнай форме ўдзелу ў перыяд з 23.12.2021 па 14.01.2021. У Палажэнні вызначаны парадак правядзення дадзенага конкурсу.
■ Выстава ёлачных цацак **"Каля казачнай ёлкі"** Віцебскага калекцыянера Наталлі Кавалёвай. Па 31 студзеня ў Слановай зале Мірскага замка.
■ Тэатр "Шатландскай пяхоты".
■ Віртуальная экскурсія "Зброя гонару і адвагі".
■ Віртуальныя экскурсіі "Аб'ядноўваючы прастору і час: беларускія землі на картах XVI — XVIII стст.".
■ Віртуальная экскурсія "На адным полі ваяры", якая аб'ядноўвае творчасць мастака Ігара Гардзіёнка і скульптара Сяргея Аганава.
■ Салон гістарычных гульняў "У князя Міхаіла".
■ Тэматычная экскурсія "Абарончыя асаблівасці Мірскага замка".
■ Тэматычная экскурсія "Архітэктурныя аб'екты замкавага комплексу".
■ Тэматычная экскурсія "Войны XX стагоддзя. Гета ў Мірскім замку".
■ Тэматычная экскурсія па пасёлку "Мір: мінулае і сучаснасць".
■ Сямейная квэст-экскурсія "Легенды і паданні Мірскага замка".
■ Экскурсійнае абслугоўванне "Гісторыя Мірскага замка".
■ Экскурсія "Прагулка вакол замка".
■ Музейны занятак "Таямніцы кафляных "люстэркаў".

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

■ **4 — Навагодні канцэрт**. Дырыжор — Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.
■ **5 — "Тры парасяці"** (балет у 2-х дзеях) С. Кібіравай. Навагодні паказ у фае тэатра. Пачатак у 11.20. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 12.00.
■ **5 — "Шчаўкунок"** (балет у 2-хдзеях) П. Чайкоўскага. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 19.00.
■ **6 — Навагодні канцэрт**. Дырыжор — Уладзімір Авадок. Пачатак у 19.00.
■ **8 — "Чароўная музыка"** (опера-казка ў 2-х дзеях) М. Мінкова. Навагодні паказ у фае тэатра. Пачатак у 11.20. Дырыжор — Іван Касцяхін. Пачатак у 12.00.
■ **8 — Канцэрт "Шэдэўры оперы"**. Пачатак у 19.30.
■ **9 — Канцэрт "Штраўс запрашае..."**. Дырыжор — Мікалай Калядко. Пачатак у 18.00.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

■ **3 — Спектакль "У пошуках Дзеда Мароза". ПРЭМ'ЕРА**. Пачатак у 14.00; 17.30.
■ **4— Спектакль "У пошуках Дзеда Мароза". ПРЭМ'ЕРА**. Пачатак у 14.00; 17.30.
■ **8 — Танцавальна-забаўляльная праграма "Навагодняя пошта"**. Пачатак у 11.00.
■ **9 — Танцавальна-забаўляльная праграма "Навагодняя пошта"**. Пачатак у 11.00.

"Калядныя цуды" ў музеі

У святочны час афіша ажно стракаціць разнастайнымі прапановамі для дзятвы. Але, маючы такі вялікі выбар, многія бацькі імкнуцца, каб забаўляльны складнік арганічна спалучаўся з пазнавальным і выхаваўчым, а сама імпрэза была прасякнутая нацыянальным духам. Менавіта такім крытэрыям адпавядаюць калядныя праграмы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Разлічаныя яны на шкаляроў малодшага і сярэдняга ўзростаў, а таксама на сямейную аўдыторыю. Як дабіцца таго, каб тут ім было не менш цікава, чым у музеі якіх робатаў або гаджэтаў? Пагадзіцеся, задача няпростая.

Падчас каляднай праграмы.

Ілья СВІРЫН / Фота Сяргея Ждановіча

Святочныя праграмы музея ладзяцца на базе выставы "Калядныя цуды", якая знаёміць з зімовымі святочнымі традыцыямі нашых продкаў — як далёкіх, гэтак і адносна нядаўніх. Экспазіцыя пераносіць то ў традыцыйную сялянскую хату, то ў шляхецкі маёнтак, а то і ў паваенную мінскую кватэру з моднай на той час радыёлай. Асаблівую атмасферу ствараюць карціны на калядную тэматыку і, вядома, радкі класікаў.

І ўсё гэта ажывае дзякуючы аповеду гіда. Яна ўмее інтрыгаваць, правакаваць цікавасць, трымаць увагу... Падчас кароткай і зусім не сумнай экскурсіі дзятва даведваецца багата новых для сябе слоў: вігілія, куцця... урэшце, вінілавая кружэлка. І пэўная інфармацыя пра беларускія калядныя звычаі ў юных розумах, без сумневу, адкладзецца.

Але ж адным знаёмствам з даўнімі традыцыямі справа не абмяжоўваецца. Бадай, асноўная ідэя праграмы — засведчыць, што яны з часам развіваюцца і трансфармуюцца. І таму яна мае амбітны намер — пакласці пачатак новай традыцыі. Спярша дзеці разам з гідам прыдумляюць калядную казку, а потым кожны ўласнаручна стварае адмысловую скарбонку, куды хавае сваё патаемнае пажаданне. Такі творчы інтэрактыў малыя ўспрымаюць з імпэтам. Тым болей творца ў такім узросце — літаральна кожны першы.

Праграма "Калядныя цуды" разлічаная найперш на "арганізаваную" аўдыторыю. Нічога дрэннага ў такіх культпаходах я зусім не бачу — наадварот, гэта важная частка ненавязлівага, але эфектыўнага выхавання ў нацыянальным рэчышчы.

А вось на другую праграму — «Ой, каб калядак нядзель дзясятак...» — дзетак прыводзяць непасрэдна бацькі ды разам там водзяць карагоды. Атрымаўся цудоўны фармат сямейнай імпрэзы, вельмі ў наш час актуальны. У музей завітваюць калядоўшчыкі, чый гурт па дарозе трохі паменеў. Вакантныя месцы казы, мядзведзя і механошы займаюць дзеці з ліку прысутных. Усе ахвотна развучваюць калядныя песні — прычым аўтэнтычныя, а не стылізаваныя. Ды і гучаць яны па-народнаму, а не па-эстраднаму — ад чаго, дарэчы, зусім не губляюць зухаватасці.

Магчыма, нехта назаве такі падыход легкадумным, маўляў, трэба спярша назбіраць грунтоўны багаж ведаў, прасякнуцца традыцыяй, а не проста з ходу схопліваць тэкст і мелодыю. Але для сучаснага "паспалітага" гарадскога жыхара важна стварыць саму магчымасць спрычыніцца да фальклорных традыцый. А што да гульнявой формы... Дык калядаванне ўжо па сваёй сутнасці ёсць гульнёй.

Важна тое, што такія імпрэзы адпавядаюць асветніцкай місіі. Яны могуць паспрыяць першаму знаёмству з музеем, дапамагчы юнай аўдыторыі знайсці туды дзверы. Зацікавіцца гэтым адмысловым светам, дзе кожная, нават простая з выгляду рэч мае вялікую каштоўнасць. Прасякнуцца павагай да музейных экспанатаў і навучыцца сябе сярод іх паводзіць.

К

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").